# ДУХОЎНАЯ МУЗЫКА Ў СУЧАСНЫМ ХАРАВЫМ МАСТАЦТВЕ: ЦЫКЛ Я. ПАПЛАЎСКАГА «НА НАРАДЖЭННЕ ХРЫСТОВА І КАЛЯДЫ»

***Т. С. Гажэўская,***

*дацэнт кафедры харавога і вакальнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яўген Уладзіміравіч Паплаўскі – член Саюза кампазітараў Беларусі, удзельнік розных музычных форумаў, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Чалавек з багатымі ведамі, непахіснымі памкненнямі рэалізаваць сябе як мага паўней.

Я. Паплаўскі скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класе кампазіцыі прафесара Д. Б. Смольскага ў 1986 г. Стажыраваўся пад кіраўніцтвам С. М. Сланімскага ў Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі, браў удзел у майстар-класах Тон дэ Лэюва. У 1991 г. па яго ініцыятыве ў Мінску быў арганізаваны Міжнародны фестываль сучаснай камернай музыкі, які праводзіўся кожныя два гады (да 1995 г.).

Працягваў вучобу за мяжой. Стажыравацца яму прапанавала польскае пасольства. З 1997 г. па 1999 г. атрымліваў стыпендыю польскага ўрада, працаваў у Гданьску ў Акадэміі музыкі імя Станіслава Манюшкі над творам для сімфанічнага аркестра «Барбара Радзівіл» і студыі электраакустычнай музыкі Акадэміі музыкі ў Кракаве над уласным творчым праектам.

Творы Я. Паплаўскага выконваліся на міжнародных фестывалях сучаснай музыкі ў Нідэрландах, Італіі, Іспаніі, Чэхіі, Польшчы, Аргенціне, Бразіліі, Расіі і ЗША. Сярод іх трэба адзначыць сімфанічныя эскізы «Поразава», электронную сімфонію «Карозія часу», твор «Лунаючы ў прасторы», у якіх выкарыстаны напрацоўкі аўтара ў галіне музычнай мовы, каларыстыкі і санорнай тэхнікі пісьма. Менавіта ў рамках фестывалю «Варшаўская восень» адбылася прэм’ера сачынення «Маё – Ёй». Твор быў напісаны па заказе для ансамбля салістаў «Класік-Авангард».

Я. Паплаўскі актыўна цікавіцца гісторыяй музычнага жыцця ў Беларусі. Ён быў адным з заснавальнікаў і дырэктарам (да 1996 г.) Нацыянальнага тэатральна-канцэртнага аб’яднання «Беларуская капэла», створанага ў 1992 г. Мэта гэтага аб’яднання – пошук,

вывучэнне і ўвядзенне ў выканальніцкую практыку старадаўняй беларускай музыкі. Плённа працаваў кампазітар у архівах бібліятэк Лондана, Кракава, Варшавы, Познані, Гданьска і Санкт-Пецярбурга. Знойдзеныя матэрыялы сталі асновай рэпертуару штогадовага фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы». Ён таксама з'яўляецца аўтарам сцэнарыя балета «Тэагонія» паводле Гесіёда, у якім узноўлены прынцыпы тэатра Уршулі Радзівіл. Паводле яго драматургічнай ідэі ў 1995 г. быў пастаўлены балет «Паланэз» на музыку Міхала Клеафаса Агінскага.

Творы Я. Паплаўскага характарызуюцца глыбінёй думкі, арыгінальнасцю задумы, непарыўнасцю абстрактнага мыслення з традыцыямі. Кампазітар праявіў сябе і як апантаны даследчык беларускай музычнай гісторыі. Яму ўдалося зламаць стэрэатып, што гісторыя беларускага музычнага мастацтва пачалася пасля 1917 г. Праца ў архівах замежжа не была дарэмнай. Адна са значных знаходак – рукапіс «Te Deum Laudamus» Восіпа Казлоўскага – аўтара вялікага палатна для двух хароў, сімфанічнага аркестра, аргана і салістаў. Яшчэ адзін поспех – адкрыццё оперы Антонія Генрыха Радзівіла «Фаўст». Клавір гэтай оперы Я. Паплаўскі знайшоў у Санкт-Пецярбургу, а партытура захоўвалася ў бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве. З Пецярбургскіх крыніц ён прывёз музыку братоў Аляксандра і Міхала Ельскіх, а матэрыялы оперы Канстанціна Горскага «Маргер» і іншыя сачыненні былі знойдзены ім у познаньскіх і варшаўскіх архівах.

Напалеон Орда, Антон Абрамовіч, Юзаф Ігнацы Крашэўскі, Міхал Казімір Агінскі, Ігнат Ляўковіч, Юзаф Дашчынскі – вось далёка не поўны пералік імён творцаў, чые, здаецца, страчаныя творы былі адшуканы Я. Паплаўскім у кнігасховішчах і вернуты ў мастацка-выканальніцкі кантэкст.

Усё гэта друкуецца. Ужо пабачыў свет восьмы зборнік серыі «Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай нацыянальнай бібліятэкі», рыхтуецца дзявяты.

Звяртаючыся да харавога цыкла «На Нараджэнне Хрыстова і Каляды»[1], трэба адзначыць, што Каляды – адно з самых містычных свят у старажытных славян. Яно менш звязана з сельска-гаспадарчым цыклам, а больш з будовай і рухам сусвету. Першы

[1] *Паплаўскі, Я. У.* На Нараджэнне Хрыстова і Каляды : харавы цыкл для змешанага хору / Я. У. Паплаўскі. – Мінск : А. М. Вараксін, 2007. – 32 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзень Каляд, у які даўжыня светлавога дня пачынала павялічвацца пасля зімовага сонцастаяння, звычайна прыходзіўся на 23–24 снежня, лічыўся пачаткам астранамічнага новага года. Слова *каляды* паходзіць ад лацінскага calendae (календы) – назва першага дня кожнага месяца (ад гэтага кораня паходзіць слова *каляндар,* а таксама ад старажытнай назвы сонечнага дыску – кола).

Каляды, каляда – дахрысціянскае свята, звязанае з перыядам зімовага сонцастаяння. З усталяваннем хрысціянства яно было прымеркавана да свят Раства Хрыстова і Хрышчэння. Немагчыма ўявіць Каляды без містэрыі. Яна пачыналася ў першы дзень Каляд і заканчвалася апошнім. У час зімовага сонцастаяння дзеля нашых продкаў адчыняліся дзверы паміж светам існасці і мроі, жывых і памерлых, усё было прасякнута чароўным і небяспечным духам таемнасці. Для беларусаў магічны сэнс свята, багаты стол, падарункі, паходы ў госці адзін да аднаго, містычны дух нараджэння новага, таямніцы ды казкі – гэтае спрадвечнае свята і да сёння застаецца радасным, велічным і аптымістычным.

Харавы цыкл «На Нараджэнне Хрыстова і Каляды» быў напісаны ў 2006 г. Ён складаецца з сямі твораў для змешанага хору без суправаджэння: «Найсвяцейшая», «Божа, Ойча наш», «А ўчора з вячора», «Ночка ціхая, зарыста», «Бог прыняў людское цела», «Зорка Бэтлеемска» і «Дзень калядны слаўны».

Нягледзячы на тое, што кампазітар выкарыстоўвае кананічны тэкст каталіцкай царквы, менавіта тэксты ўзяты з беларускага малітоўніка «Ойча наш…» (Мінск : Pro Christo, 2000), мелодыі яго арыгінальныя, пранікнутыя глыбокім сэнсам, асаблівай духоўнай прыгажосцю.

Кампазітар імкнуўся дакрануцца да нечага таямнічага, сакральнага праз гарманічнае суаднясенне салістаў з хорам, акордавага і гамафонна-гарманічнага складу харавой фактуры, меладызацыі кожнай лініі. Музыка цыкла паэтычная, нясе ў сабе душэўную чысціню, шчырасць, непасрэднасць выказвання. Аўтар трактуе хор як своеасаблівы інструмент з новымі тэмбральнымі мажлівасцямі. Вельмі часта выкарыстоўвае прыём згушчэння і разрэджвання гукавой шчыльнасці. Для кожнай часткі знаходзіць арыгінальныя сродкі выразнасці. Улюбёнымі прыёмамі з’яўляюцца разнастайнае выкарыстанне divisi, а таксама характэрных рэгістравых мажлівасцей. Выбраны дастаткова спакойныя, павольныя тэмпы. Справа ў тым, што каданс у касцельнай музыцы – гэта духоўны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімвал, свайго роду «амэн». Таму каданс як вынік развіцця дапускае пашырэнне, запавольванне гучання.

Кампазітар выкарыстоўвае адзін з метадаў сачынення – санорыку, – заснаваны на выкарыстанні тэмбрафарбаваных гучнасцей – санораў. Саноры – гэта своеасаблівыя спалучэнні гукаў, якія ўспрымаюцца як адзіная гукавая фарба, у якой асобныя гукі ці інтэрвалы не выяўляюцца і не ўспрымаюцца выразна на слых. Асаблівасць санорыкі – у перавазе фанічнага, фарбаванага боку, які абумоўлены спецыфічнымі гукавышыннымі адносінамі, а таксама значна павялічанай каардынаванай роляй тэмбраартыкуляцыйных і дынамічных сродкаў.

Найбольшы эфект ад выкарыстання санорных гучанняў узнікае ў цыкле пры спалучэнні іх з іншымі формамі арганізацыі музычнага матэрыялу, напрыклад, у пераходах ад фарбаваных санорных кластараў да аднаго вытрыманага тону. Яшчэ адзін метад сачынення, які кампазітар выкарыстоўвае ў гэтым цыкле – каларыраванне. Гэта свайго роду тэхніка меладычнага вар’іравання, сутнасць якой – у змяненні напеву, дадаванні да яго тонаў шматлікіх дапаможных і прамежкавых гукаў.

Часам кампазітарскім прыёмам музычнага стылю Я. Паплаўскага з’яўляецца выкарыстанне энгарманізмаў. Партытура вызначаецца аб’ёмнасцю гучання ў спалучэнні з празрыстым гукапісам, тонкімі харавымі фарбамі. Кожны хор у цыкле пранікнуты светлым настроем і пачуццём вялікага хрысціянскага свята.

Кампазітар надае шмат ўвагі сучаснаму запісу нотнай партытуры, напрыклад, замест лігі на доўгіх вытрыманых гуках выкарыстоўваюцца працяжныя рыскі.

Харавы цыкл «На Нараджэнне Хрыстова і Каляды» павінен выконвацца менавіта ў храме, дзе добрая акустыка і атмасфера духоўнасці, малітоўнага пачуцця і ўзнёсласці. Духоўная музыка, якая вырвалася з глыбокіх сховаў і зноў набывае крылы, павінна, не ведаючы меж, злятаць да нас з нябёс і ахінаць людскія душы красой, чысцінёй і пяшчотай. Слухаючы такі твор, чалавек раскрываецца душою на дабро, прыгажосць, на Бога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ